# МІЖНАРОДНАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ «МУЗЕЙ І КУЛЬТУРНАЯ СПАДЧЫНА: ГІСТОРЫЯ, СУЧАСНАСЦЬ, ПОГЛЯД У БУДУЧЫНЮ» (Мінск, гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, 27–28 чэрвеня 2017 г.)

# INTERNATIONAL CONFERENCE «MUSEUM AND CULTURAL HERITAGE: A DISCOURSE ON THE PAST HISTORY, PRESENT STATE AND FUTURE PROSPECTS» (Minsk, faculty of history, Belarusian State University, 27–28 June, 2017)

У Мінску на гістарычным факультэце БДУ 27–28 чэрвеня 2017 г. адбылася Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Музей і культурная спадчына: гісторыя, сучаснасць, погляд у будучыню», прысвечаная 25-годдзю адкрыцця ва ўніверсітэце спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па напрамках)». Арганізатарам канферэнцыі выступіла кафедра этналогіі, музеялогіі і гісторыі мастацтваў, якая з’яўляецца прафілюючай (выпускаючай) для студэнтаў гэтай спецыяльнасці.

Пленарнае пасяджэнне адкрылася прывітальным словам да ўдзельнікаў канферэнцыі дэкана гістарычнага факультэта Г. А. Каханоўскага. Выступленне А. А. Гужалоўскага (Мінск) было прысвечана асноўным кірункам развіцця музейнай справы Рэспублікі Беларусь. Дакладчык адзначыў, што гэта сфера культуры ў краіне, бадай, як ніякая іншая, нясе на сабе адбітак усіх праблем, якія стаяць перад грамадствам у перыяд глыбокіх пераўтварэнняў. Гэта, у сваю чаргу, вымушае айчынную музейную супольнасць задумвацца над глыбінным сэнсам музейнай дзейнасці і займацца пошукамі новых напрамкаў, сродкаў і метадаў работы. Інавацыі ў прававым забеспячэнні работы беларускіх музеяў ахарактарызаваў у сваім дакладзе Д. Г. Шляхцін (Мінск). Асаблівую ўвагу выступовец надаў месцу і ролі музейнага заканадаўства ў вучэбных планах падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі музейнага персаналу ў Рэспубліцы Беларусь. Даследчыца А. М. Масцяніца (Санкт-Пецярбург) прапанавала ўдзельнікам канферэнцыі ўласнае бачанне эвалюцыі культурна-адукацыйнай сацыяльнай функцыі музея на сучасным этапе. Пленарнае пасяджэнне працягнулася выступленнем А. В. Булавы (Варшава), прысвечаным гістарычнаму шляху і сучаснаму стану Музея польскай арміі ў Варшаве. Дакладчык падкрэсліў значэнне, якое надае кіраўніцтва культурна-адукацыйнаму аспекту дзейнасці буйнейшага ваенна-гістарычнага музея Польшчы. Даклад Г. А. Чучвагі (Эдмантан), прачытаны аўтарам у рэжыме відэаканферэнцыі, пазнаёміў слухачоў з арганізацыяй дзейнасці і асноўнымі формамі работы музеяў Канады. У прыватнасці, даследчыца спынілася на ролі дзяржавы і грамадскай ініцыятывы ў музейнай сферы, новых формах узаемаадносін музея і наведвальніка, а таксама канадскіх музейных інтэрнэт-праектах.

Пасля заканчэння пленарнага пасяджэння работа канферэнцыі працягнулася на дзвюх секцыях – «Музей як сацыякультурны інстытут» і «Музей як камунікацыйная сістэма». Работу адкрыла Т. А. Бембель (Мінск), якая ў сваім дакладзе «*ICOM Belarus* як магчымасць інтэграцыі айчынных музеяў у сусветны кантэкст» прааналізавала міжнародны аспект музейнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на сучасным этапе. Даследчыца вызначыла праблемныя кропкі ў міжнародным супрацоўніцтве беларускіх музеяў, іх дасягненні, паказала перспектывы пашырэння ўдзелу айчынных спецыялістаў у Міжнародным савеце музеяў. Найважнейшы напрамак навукова-фондавай дзейнасці Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея – камплектаванне фондавага збору – абраў у якасці тэмы свайго даклада А. Ф. Вашкевіч (Гродна). Асобы акцэнт выступовец зрабіў на важнасці гісторыка-бытавых музейных экспедыцый, а таксама спецыфіку іх арганізацыі і правядзення. Уплыў антрапацэнтрызму на новыя экспазіцыйныя праекты Краязнаўчага музея Полацка прадэманстравала ў сваім дакладзе С. В. Гаўрылава (Полацк). Аўтар паказала, як антрапацэнтрычная канцэпцыя рэалізуецца падчас экспазіцыйнай прэзентацыі мясцовай гісторыі, чым яна адрозніваецца ад традыцыйнай для краязнаўчых музеяў падачы матэрыялу. У дакладзе М. В. Казанцавай (Мінск) была зроблена арыгінальная спроба рэканструкцыі калекцыі фарфору з даваеннага фондавага збору Беларускага дзяржаўнага музея. Даследчык Ю. В. Кітурка (Гродна) разгледзеў асноўныя спрэчныя пытанні рэстаўрацыі і музеефікацыі Старога замка ў Гродне. У прыватнасці, дакладчык пазнаёміў удзельнікаў канферэнцыі з праектам рэканструкцыі замка ў канцэпцыі архітэктара У. Бачкова. З уласным бачаннем рэстаўрацыі гэтага аб’екта культурнай спадчыны выступіў гісторык М. А. Волкаў (Мінск). Важную інфармацыю па вывучэнні і захаванні археалагічнай спадчыны Слуцка змяшчала выступленне Л. У. Калядзінскага (Мінск). Сярод іншага аўтар узняў пытанне фізічных умоў за-

хавання археалагічных артэфактаў у фондасховішчы Слуцкага краязнаўчага музея. Абмеркаванне розных аспектаў тэмы захавання і вывучэння археалагічнай спадчыны ў музеях была працягнута ў дакладах Р. І. Крыцука (Мінск) «Грашова-рэчавы скарб 1665 г. з вёскі Пагост-Загародскі», У. А. Юргенсана (Мінск) «Клады першай паловы XVII ст. як зрэз грашовага абарачэння», Н. А. Пачобут (Гродна) «Музей Фарнага касцёла ў Навагрудку», а таксама А. А. Хацько (Гродна) «Праблема камплектавання і атрыбуцыі будаўнічай керамікі (на прыкладзе ГДГАМ)». Шэраг дакладаў быў прысвечаны комплекснаму аналізу музея як сацыякультурнага інстытута. Першы з іх пад назвай «Мемарыяльны комплекс Брэсцкая крэпасць-герой як сацыякультурны інстытут у часе і прасторы» прачытала А. У. Міцюкова (Брэст). Пасля кароткага гістарычнага экскурсу даследчыца засяродзілася на праблемах, з якімі сутыкаецца мемарыяльны комплекс на сучасным этапе развіцця, а таксама вызначыла перспектыўныя кірункі пашырэння ў ім музейнай дзейнасці. Падобную структуру меў даклад М. С. Шуміна (Мінск) пад назвай «Музей гісторыі медыцыны Беларусі: сучасны стан і перспектывы развіцця», а таксама Т. А. Навагродскага (Мінск) «Стварэнне і дзейнасць клуба-музея Чэслава Немэна ў в. Старыя Васілішкі Шчучынскага раёна». Малавядомы бок дзейнасці Музея гісторыі БДУ – падрыхтоўку кадраў для турыстычнай індустрыі Рэспублікі Беларусь – абралі ў якасці тэмы даклада І. У. Алюніна і Э. Л. Маліноўская (Мінск). На шматлікіх прыкладах выступоўцы падрабязна паказалі практычныя магчымасці музея ўстановы вышэйшай адукацыі ў галіне прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў напрамку «Культурная спадчына і турызм» спецыяльнасці «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». Асноўныя этапы і праблемы, якія суправаджаюць працэс музеефікацыі традыцыйнай музычна-інструментальнай спадчыны Беларусі паказаў С. Э. Чаус (Мінск). Не абмяжоўваючыся канстатацыяй праблемных сітуацый, дакладчык прапанаваў уласнае бачанне выйсця з іх з мэтай стварэння новых інтэрпрэтацыйных мадэлей дадзенай часткі Дзяржаўнага музейнага фонду. Выступленне М. С. Моніча (Мінск) было прысвечана асаблівасцям музеефікацыі прадметаў дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва краін Усходу.

Адной з задач канферэнцыі з'яўлялася навуковае асэнсаванне ролі музейнай камунікацыі ў арганізацыі музейнай дзейнасці ў сучасных умовах. Увага дакладчыкаў секцыі «Музей як камунікацыйная сістэма» была скіравана галоўным чынам на экспазіцыйна-выставачную і культурна-адукацыйную дзейнасць, дзе камунікацыйныя аспекты адлюстраваны найбольш яскрава. Так, І. В. Іваноў (Мінск) у паведамленні «Навуковая канцэпцыя і мастацкі падыход у экспазіцыі "Падняпроўскае шапавальства"» паказаў падрыхтоўку тэматычнай экспазіцыі на базе фондавых калекцый Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, якая была адкрыта ў маі 2016 г. У архітэктурным помніку «Вяночны двор з в. Бракава Слабада Чавускага раёна» дэманструецца народнае майстэрства па вырабе з воўны галаўных убораў, валёнкаў, лямцу праз стасункі з носьбітамі традыцыйнай рамеснай тэхнікі. Даследчыца К. С. Даўгапалюк (Мінск) пазнаёміла слухачоў з асаблівасцямі выкарыстання малых архітэктурных форм у ансамблевай экспазіцыі на прыкладзе ўсталявання прыдарожнага абракальнага крыжа на экспазіцыйным сектары Падняпроўе ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Прыдарожныя абракальныя крыжы з'яўляюцца неад'емным элементам беларускай вёскі, адлюстроўваюць істотную з'яву матэрыяльнай і духоўнай культуры беларусаў. Даклад У. І. Мядзяніка і Ю. Л. Уласюка (Мінск) адлюстраваў праблемы прадстаўлення тэмы «Брэсцкі замак» у экспазіцыях музеяў Брэста. Аб узаемадзеянні музейных і архіўных устаноў у справе захавання, выкарыстання і папулярызацыі дакументальнай спадчыны ішла гаворка ў дакладзе Ю. Ф. Крыўдзюк (Мінск) «Музеі і архівы: сумесная выставачная дзейнасць як аснова для захавання і папулярызацыі дакументальнай спадчыны (паводле матэрыялаў Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь)».

На пасяджэнні секцыі разглядаліся таксама пытанні арганізацыі культурна-адукацыйнай дзейнасці музеяў, яе тэхналогіі, а таксама інавацыйныя метады і формы работы з рознымі катэгорыямі наведвальнікаў у музеі. У прыватнасці, Э. Кавальская (Варшава) падзялілася вопытам адукацыйнай дзейнасці Катынскага музея, які з'яўляецца музеем новага тыпу. Гэта датычыцца як экспазіцыі, якая спалучае значную базу аўтэнтычных музейных прадметаў з сучаснай мультымедыйнай тэхнікай, так і культурна-адукацыйнай работы ўстановы. Апошняя грунтуецца на прынцыпе персаналізацыі і выкарыстанні разнастайных форм, у тым ліку выхад за музейныя сцены з дапамогай выстаў, конкурсных праектаў, лекцыйных цыклаў, якія рэалізуюцца як у Польшчы, так і за межамі краіны. Дакладчыца І. І. Бамбешка (Мінск) паказала асноўныя тэндэнцыі развіцця культурна-адукацыйнай дзейнасці рэгіянальных краязнаўчых музеяў Беларусі ў апошнія два дзесяцігоддзі. У дакладзе А. М. Жукавай і І. У. Марчанка (Мінск) на тэму «Практыка-арыентаваныя інструменты маркетынгу ў культурна-адукацыйнай дзейнасці музея» зроблена грунтоўнае даследванне маркетынгавых тэхналогій пры стварэнні і ўдасканаленні музейнага прадукта, прааналізаваны ўплыў гэтых тэхналогій на розных этапах яго жыццёвага цыклу. Аўтары прыйшлі да высновы пра тое, што выкарыстанне маркетынгавых тэхналогій павышае эфектыўнасць

работы музея і забяспечвае базавыя патрабаванні арганізацыі. Узровень сучаснай падрыхтоўкі спецыялістаў у галіне культурна-адукацыйнай дзейнасці музея прааналізавала В. У. Міронгчык (Мінск). Аб культурна-адукацыйнай рабоце Столінскага краязнаўчага музея, скіраванай на развіццё творчага патэнцыялу падлеткаў, паведаміла К. І. Жаўнерык (Столін). У дакладзе А. М. Жукавай (Мінск) і І. А. Юдзінай (Ветка) «Нацыянальна-культурны аспект музейна-адукацыйнай праграмы "Якуб Колас – за навуку!"» раскрыты змест аўтарскай музейна-адукацыйнай праграмы, метады і падыходы пры яе рэалізацыі ў студзені – красавіку 2017 г. на базе Музея кнігі Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Асноўнай мэтай пілотнай праграмы стала далучэнне вучняў да роднага слова шляхам паглыблення ў нацыянальна-культурную прастору ў музеі, знаёмства з літаратурнай і навукова-педагагічнай спадчынай Якуба Коласа. Праграма стала цікавым педагагічным эксперыментам, які паказаў магчымасці выкарыстання сучаных тэхналогій і метадаў музейнай педагогікі, падкрэсліў асаблівую ролю музея ў справе папулярызацыі беларускай мовы, нацыянальнай культуры і спадчыны. Вопытам культурна-асветніцкай работы студэнцкай навукова-даследчай лабараторыі «Сябры музея» пры кафедры гісторыі Беларусі Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Францыска Скарыны падзялілася Н. В. Карнікава (Гомель).

Абмеркаванне новых форм работы музея ішло ў дыскусійнай форме. У дакладзе «Квэст як інавацыйная форма ўзаемадзеяння сучаснага музея з наведвальнікам» В. У. Макарчук (Гродна) падзялілася вопытам выкарыстання новых метадаў працы з музейнай аўдыторыяй, сярод якіх найбольш запатрабаваным у наведвальнікаў стаў музейны квэст – унікальнае спалучэнне гульні і пазнавальнага працэсу, падчас якога адбываецца знаёмства з гісторыяй, асаблівасцямі прыроды, культурнымі традыцыямі роднага краю. Ідэя і агульная логіка квэсту заключаецца ў праходжанні ўдзельнікамі невядомага квэставага маршруту з адначасовым атрыманнем новых ведаў. У дакладзе А. М. Рысь (Кобрын) разглядалася клубная форма работы Кобрынскага ваенна-гістарычнага музея імя А. В. Суворава з падлеткамі. Выкарыстанне новых музейных методык спрыяе паспяховай навукова-даследчай рабоце, эфектыўнай рабоце школы юнага экскурсавода, развіццю творчых здольнасцей членаў клуба «Музей для юных сяброў».

Два даклады былі прысвечаны актуальным праблемам вывучэння наведвальніка ў сацыялагічным ракурсе і спосабаў узаемадзеяння музея з рознымі сегментамі аўдыторыі, што з'яўляецца неабходнай умовай удасканалення экспазіцыйна-выставачнай і культурна-адукацыйнай работы музея. Уласны погляд на даследаванне адносін наведвальнікаў да музейнага прадукта выказала К. У. Навіцкая (Мінск). У прыватнасці, у дакладзе «Музейная прастора і наведвальнік. Як даследаваць наведвальніка (пастаноўка праблемы)» аўтар абгрунтавала думку пра тое, што асабліва актуальнай для большасці музеяў з'яўляецца праблема культуры наведвання. У дакладзе «Музейная прастора і наведвальнік: журналісты» С. В. Клюцкі (Мінск) засяродзіў увагу на праблемах узаемадзеяння музея з наведвальнікам, прааналізаваў вопыт непасрэдных стасункаў супрацоўнікаў Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны з прадстаўнікамі розных СМІ. Дакладчык выказаў прапановы па арганізацыі сацыялагічных даследаванняў наведвальнікаў з мэтай выяўлення агульных тэндэнцый развіцця музеяў краіны, а таксама прыняцця варыянтаў вырашэння праблем на рэспубліканскім узроўні.

На падсумаванні вынікаў канферэнцыі было выказана адзінадушнае меркаванне аб мэтазгоднасці правядзення на гістарычным факультэце БДУ рэгулярных канферэнцый, прысвечаных айчыннай музейнай справе, а таксама праблемам захавання, вывучэння і выкарыстання культурнай спадчыны.

*Л. У. Бярэйшык,*
кандыдат гістарычных навук, дацэнт
*А. А. Гужалоўскі,*
доктар гістарычных навук, прафесар